УДК 882.6.09

С.І. ДАНІЛЕНКА

# МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АДЛЮСТРАВАННЯ ШЛЯХЕЦКАГА ГЕТЭРАСТЭРЭАТЫПУ Ў АПАВЯДАННІ Л. РУБЛЕЎСКАЙ "ГАЙВАРОНЫ"

*Мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне і апісанне найбольш тыповых асаблівасцей мастацкага асэнсавання семантыкі сацыяльных стэрэатыпаў польска-беларускай шляхты ў творах беларускіх пісьменнікаў на прыкладзе творчасці Л. Рублеўскай.*

*Навацыя прааналізаванага твора заключаецца ў пераасэнсаванні старых саслоўных стэрэатыпаў праз прызму стэрэатыпаў канфесійных. Так, да канца XX ст. у кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў саслоўны (шляхціц – селянін) і этнічны (паляк – беларус) складнікі "сармацкай" сістэмы стэрэатыпаў у большай (саслоўны) ці меншай (этнічны) ступені страцілі сваю актуальнасць для беларускага грамадства, перастаўшы з'яўляцца для яго моцнымі дэзінтэграцыйнымі фактарамі, перашкодамі для этнічнай кансалідацыі. І ў якасці такой перашкоды найбольш трывалай аказалася сістэма канфесійных стэрэатыпаў, якая, падобна да этнічных, генетычна паходзіла ў свой час ад саслоўных.*

*Увасоблены ў апавяданні Л. Рублеўскай сармацкі гетэрастэрэатып вызначаецца рашучым мастацкім асуджэннем саслоўных каштоўнасцей былой польска-беларускай шляхты як дэзінтэграцыйнага сацыяльнага фактару, адмаўленнем стваральнай ролі былых саслоўных эліт у станаўленні беларускай нацыі як выніку мадэрнізацыйных працэсаў.*

Апавяданне Л. Рублеўскай "Гайвароны" з'яўляецца яскравым узорам мастацкага асэнсавання беларускімі пісьменнікамі сістэмы шляхецкіх сацыяльных стэрэатыпаў, на якіх грунтаваўся пафас неасармацкай плыні польска-беларускага рамантызму.

Фабула апавядання досыць простая: у другой палове XIX ст. у старым маёнтку, занядбаным і "*абрабаваным*", самотна жыве сям'я Вайтылавых – маці з дачкой. Муж гаспадыні памёр, двое сыноў, шчырыя патрыёты незалежнасці Рэчы Паспалітай, загінулі ў час паўстання 1863 г. Трэці, малодшы, згінуў без весткі на сібірскай катарзе, пакараны ваенным судом у Бабруйскай крэпасці. І вось звыклы ход жыцця карэнным чынам мяняецца, калі аднойчы ўвосень да іх дома прыходзяць два паломнікі па святых мясцінах.

Адразу неабходна адзначыць, што дастаткова невялікае аб'ёмам апавяданне вельмі насычана шматлікімі рэмінісцэнцыямі з "антысармацкіх" твораў беларускай літаратуры. Так, дзеянне апавядання адбываецца дзесьці ўвосень 1877 ці 1878 г. (на час паўстання дваццацічатырохгадовая дачка гаспадыні Галена мае дзесяць год узросту), прыкладна, як і ў аповесці У. Караткевіча (увосень 1888 г. народжаная ў 1870 г. Надзея Яноўская святкуе сваё васемнаццацігоддзе), і дом дзвюх самотных гаспадынь з'яўляецца ледзь не "двайніком" Балотных Ялін. Ён адасоблены ад навакольнага свету змрочным старым паркам, "*па змрочных прысадах якога даўно не прахаджваліся вясёлыя госці, а цёмныя ліпы былі такімі старымі, што, здавалася, вось-вось са стогнам сагнуцца, абапіраючыся аб чорную зямлю нязграбна выцягнутымі лапамі*" [1, с. 27]. У адрозненне ад навакольнага свету, у маёнтку "*усталяваўся час, незалежны ад знешняга, і ўважалі-*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*ся толькі свае законы і свае прывіды*" [1, с. 29]. Гаспадыні маёнтка "*хадзілі выключна ў жалобе*" па загінуўшым у бітве з ворагамі сваякам, а сам дом – гэта "*дом-труна*"; ён "*пераўтвораны ва ўсыпальніцу*", "*пракляты дом*", "*ненавісны дом*", вароты якога грукаюць, "*быццам вечка труны*", у ім "*магільныя камяні заслаанілі неба*".

Сімвалічнай адзнакай смерці з'яўляецца безыменнасць і амаль поўная безаблічнасць самой пані Вайтылавай у жалобных строях з "*горка падцятымі*" вуснамі, брывамі – "*як зламаныя крылы*" – і валасамі, "*гладка зачасанымі пад чорны каптур*". Адзінай яскравай, жывой і "каляровай" мастацкай дэталлю, якая характарызуе гаспадыню, выступае крэсла, падобнае на крэслы Бутрыма Няміры з апавядання В. Ластоўскага, якое з'яўляецца галоўнай святыняй маёнтка, бо "*высокае груваасткае крэсла, у якім сядзела пані Вайтылава, належала яшчэ іх продку, легендарнаму Вайтылу, мечніку князя Вітаўта, які і заснаваў маёнтак на землях, падараваных за верную службу. Дрэва ад часу зрабілася зусім чорнае, абіўку мянялі некалькі разоў – цяпер гэта быў зеленкавата-залацісты габелен. Але мядзвежая галава, частка герба Вайтылавых, усё гэтак жа пагрозна шчэрылася са спінкі*" [1, с. 30].

Не ўласнае імя гаспадыні, пра якое чытач так і не даведаецца, а радавое прозвішча і крэсла продкаў з ашчэранай мядзведжай галавой, падрапанае і неаднойчы пераліцаванае, рэпрэзентуюць яе для навакольнага свету, бо адзіна істотным і актуальным для яе з'яўляецца толькі тое, што выступае адзнакай неаслабнай сувязі з продкамі: "*А ў гэтым доме толькі мерцвякі – сапраўды жывуць... А жывыя – цені, каштоўныя толькі сваёй памяццю аб памерлых*" [1, с. 32]. Яна сама – увасабленне радавой памяці, шляхецкага кодэкса гонару, няўмольнага і пагардлівага да жыцця, бо "*гардыня, ланцуг, які прывязвае чалавека да ягоных мерцвякоў*" [1, с. 31].

Пры пэўным знешнім падабенстве дачка гаспадыні, Галена Вайтылава, "*была зусім не такой*", бо, як і Надзею Яноўскую, яе душыў цяжар радавой памяці. Але "іншасць" дачкі не выяўляецца, пакуль у маёнтак не прыходзяць вандроўнікі па святых мясцінах, адзін з якіх з'яўляецца сынам гаспадыні і братам Галены, што збег з катаргі. Але замест помсты і змагання (яму "*няма пра што гаварыць з тымі, хто жадае помсты*" [1, с. 34]) ён абірае ідэал манаскага жыцця: "*...Скіт з пачарнелага ад часу дрэва на выспе пасярод зарослага лілеямі возера, і манахчарнец корміць з рукі лебедзяў... Манастыр са сценамі, абпаленымі пажарам вайны, з выШчарбінамі ў сценах ад куль, і абраз у правым нефе міраточыць... І кожная аблачынка здаецца ўвасобленай малітвай, пазалочанай сонцам – Боскай увагай*" [1, с. 32].

Да веры, якую Алесь Вайтылаў лічыў раней "*незразумелым дзікунствам*", яго штурхае ўсведамленне граху – смерць адданых яму шаснаццаці сялян, "*лепшых людзей*", узброеных толькі косамі і дзесяткам стрэльбаў, якіх васемнаццацігадовы юнак легкадумна прывёў пад жандарскія кулі. І ў гэтых адносінах грэх Алеся Вайтылава тоесны граху героя апавядання В. Ластоўскага "Старасельскі магільнік", якому наследуе Л. Рублеўская, "*мніха*" Астапа Корсака: "*Была вайна. Астап Корсак на абарону краю вырушыў, набраўшы пад харугаў 200 душ сваіх падданых. Біўся Астап з дружынаю харобра, не з панукі чужой, а з пачуцця абавязку бараніць сваю зямельку родную ад чужацкай навалы. І ўславіўся Астап Корсак на вайне як ніхто, але супакою ён не меў на душы, што многа крыві людской, хрысціянскай крыві, праліў*" [2, с. 121]. Каб выкупіць гэты грэх, ён становіцца манахам, а потым парабкам у сялянскіх сем'ях, памёршы ўрэшце без нашчадкаў. Тым самым дзеля пакаяння і выкуплення свайго граху Астап Корсак аддае перавагу не служэнню Богу, а служэнню свайму народу: "*А будучы ў пушчы,*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*раздумаў, што пушча – гэта не пакута, што сапраўды пакутуюць не манахі па манастырах, не пустэльнікі па пушчах, а той прыгонны паднявольны народ, які працуе на паноў сваіх. І вось ён з пустыні пайшоў у адну з быўшых сваіх вёсак і прыстаў наймітам да аднаго з бяднейшых сялян*" [2, с. 121].

Алесь Вайтылаў з апавядання Л. Рублеўскай таксама ясна ўсведамляе цяжар адказнасці за тых, кім ён валадарыў паводле права нараджэння: "*Гэта былі мае людзі, з маёй радавой зямлі... Я быў юны, але гэта былі як бы мае дзеці. Даверлівыя і паслухмяныя. І загінулі толькі таму, што паверылі мне – вера ў "святую справу" не паспела ў іх выспець*" [1, с. 34]. Дзеля апантанасці "*юнацкай прагай славы*" з іншымі, такімі ж "*маладымі і дзёрзкімі*", што "*лічылі сябе Напалеонамі*", ён ахвяраваў жыццямі кармільцаў сялянскіх сем'яў. Але, у адрозненне ад Астапа Корсака, не гэтым сем'ям, а Богу вырашае ён прынесці плён свайго пакаяння.

З пункту гледжання пані Вайтылавай, падмацаванага аўтарытэтам шматлікіх продкаў-ваяроў, рубак-"сарматаў", тады, у час паўстання, ён паступіў годна, у адпаведнасці з правам пана, гонарам шляхціца і радавым абавязкам. Таму яна пазнае, але не прызнае сына-багамольца, выракшыся яго. І ў гэтых адносінах паказальны своеасаблівы рэфрэн твора, біблейская цытата пра пахаванне мёртвых. Калі адзін з вучняў Хрыстовых, што хоча следаваць за Настаўнікам, але перш просіць часу, каб пахаваць бацьку, то чуе ў адказ: "<...> *иди за Мною и предоставь мертвым погребать своих мертвецов*" (Ев. Матфея 8, 22). Тым самым хрысціянская дактрына веру і абавязак перад Госпадам ставіць вышэй за абавязак перад сям'ёй-родам (і ў больш шырокім разуменні – народам), дзе наследаванне Хрысту – жыццё, наследаванне радавой славе – смерць, бо "*гардыня, ланцуг, які прывязвае чалавека да ягоных мерцвякоў*" [1, с. 31]. Таму сваіх мерцвякоў Алесь Вайтылаў пакідае маці ў радавым доме-труне, а сам адпраўляецца ў манастыр, ідучы ўслед за Богам.

Падобным чынам паступае і Галена, калі "*пабралася з настаўнікам Гайваронскай земскай школы. Гэта быў страшэнны мезальянс* <...> *І настаўнік быў галадранец, нават не дваранін*" [1, с. 27]. У гэтых адносінах Галена паўтарае шлях Надзеі Яноўскай, якая выйшла замуж за фальклярыста Беларэцкага, што вызначаўся "*плебейскай непачцівасцю да тытулаў*" [3, с. 14]. Тым самым, можна адзначыць, што і ў аповесці У. Караткевіча (Яноўскі, Свеціловіч), і ў апавяданні Л. Рублеўскай (браты Вайтылавы) мужчыны – дзейсныя спадкаемцы шляхецкіх радавых традыцый – альбо гінуць, альбо, стаўшы манахамі, не пакідаюць нашчадкаў. Тым самым увасабляецца ідэя таго, што шляхецкая сістэма сацыяльных стэрэатыпаў як тып светаразумення выраздзілася, страціла сваю актуальнасць і надзённасць для сучаснага беларускага соцыуму, дыскрэдытавала сябе перад судом гісторыі як сістэма каштоўнасцей уладнай эліты. Само ж саслоўе, увасобленае праз пасіўны жаночы пачатак (Надзея Яноўская, Галена Вайтылава), адкінуўшы прыналежны яму каставы ізаляцыянізм, павінна ўвайсці арганічнай часткай у структуры мадэрнізаванага беларускага грамадства. І ў гэтых адносінах апавяданне Л. Рублеўскай з'яўляецца толькі мастацкай канстатацыяй шляхецкага гетэрастэрэатыпу, выпрацаванага яе папярэднікамі.

Тым не менш, сам зварот пісьменніцы да малаактуальнай, здавалася б, для Беларусі пачатку XXI ст. "сармацкай" тэмы надзвычай паказальны, бо навацыя гэтага твора ў параўнанні з творамі папярэднікаў заключаецца ў пераасэнсаванні старых саслоўных стэрэатыпаў праз прызму стэрэатыпаў канфесійных. Так, да канца XX ст. у кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў саслоўны (шляхціц – селянін) і этнічны (паляк – беларус) складнікі "сармацкай" сістэмы стэрэатыпаў у большай (саслоўны) ці меншай (этнічны) ступені страцілі сваю актуальнасць для

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

беларускага грамадства, перастаўшы з'яўляцца для яго моцнымі дэзінтэграцыйнымі фактарамі, перашкодамі для этнічнай кансалідацыі. І ў якасці падобнай перашкоды найбольш трывалай аказалася сістэма канфесійных стэрэатыпаў, якая, падобна да этнічных, генетычна паходзіла ў свой час ад саслоўных. Апазіцыя "каталіцызм – праваслаўе" як гістарычная спадчына колішняй апазіцыі "шляхта – сялянства" на сёння, відаць, застаецца адным з найбольш моцных дэзінтэграцыйных фактараў, што тлумачыць увагу да іх сучаснай беларускай літаратуры.

Цэнтральным, бадай, вобразам апавядання з'яўляецца амаль безаблічны вобраз пані Вайтылавай. Уладная і ганарлівая галава шляхецкага роду, яна ўвасабляе саму шляхецкую Традыцыю, адмаўленне ад якой у сістэме мастацкіх каардынат Л. Рублеўскай азначае далучэнне да хрысціянства. Пісьменніца ў прынцыпе не адмаўляе пэўнай "хрысціянскасці" гаспадыні Гайваронаў. Так, тая забараняе садоўніку знішчаць кратоў, што псуюць клумбы, матывуючы гэта тым, што "*агідныя сляпыя звяркі*" – "*стварэнні божыя*" [1, с. 27]. Але пісьменніца амаль не дае ніякіх маркераў, што ўдакладняюць канфесійную прыналежнасць насельнікаў Гайваронаў. Пэўным выключэннем у гэтых адносінах з'яўляюцца "польска-каталіцкія" формы хрысцільных імёнаў дзяцей гаспадыні (Генусь, Янук, Галена) і само радавое прозвішча – досыць празрыстая алюзія на свецкае (польскае) імя папы рымскага Яна Паўла II – Караль Вайтыла. Тым самым "Вайтылавы дзеці" – каталікі. Імёны дзяцей ў дадзеным выпадку з'яўляюцца адзнакамі прыналежнасці да каталіцкай традыцыі, а "безыменнасць" маці – адзнака таго, што яна ўласна і з'яўляецца самадастатковай Традыцыяй – Каталіцтвам у дадзеным выпадку, якой не патрэбны дадатковыя азначэнні.

Канфесійны вектар сацыяльнай стратыфікацыі беларускага грамадства ўжо асэнсоўваўся У. Караткевічам у кантэксце маральнага супрацьстаяння Рамана Старога і караля Стаха ў аповесці "Дзікае паляванне караля Стаха". Але ва ўмовах савецкага атэізму аўтар вымушаны быў асэнсоўваць канфесійныя супярэчнасці ў святле вельмі аддаленай ад сучаснасці гістарычнай перспектывы. У абставінах дэмакратызацыі норм жыцця сучаснага беларускага грамадства Л. Рублеўская мае магчымасць экстрапаліраваць асаблівасці даўніх канфесійных стасункаў на сённяшнюю глебу, асэнсоўваючы пры дапамозе іх спецыфіку духоўнага жыцця сучаснага беларускага соцыуму. Дэмакратычнае свецкае грамадства прадугледжвае прынцып свабоды волі, які рэалізуецца на практыцы ў свабоднай канкурэнцыі розных рэлігійных поглядаў і дактрын. У рэаліях Рэспублікі Беларусь асноўны водападзел рэлігійнай канкурэнцыі абумоўліваецца палемікай дзвюх дамінуючых хрысціянскіх канфесій – праваслаўнай і каталіцкай. Канкурэнтнасцю гэтых канфесій вызначалася і грамадская сітуацыя, што складвалася на землях пасляформеннай Беларусі XIX ст. – часу дзеяння твора Л. Рублеўскай. У дачыненні да той сітуацыі надзвычай паказальна выснова расійскага даследчыка М. Далбілава адносна таго, што "*ў кантэксце руска-польскага супрацьстаяння ў Заходнім краі стэрэатып польскай арыстакраткі – ненавісніцы Расіі і фанатычнай прыхільніцы каталіцкай экспансіі – мог азначаць місіянерскую пасіўнасць і заняпад маральнага аўтарытэта праваслаўнага духавенства*" [4, с. 174]. Таму Л. Рублеўская бачыць шлях пераадолення канфесійнай дэзінтэграцыі сучаснага беларускага грамадства ва ўмовах рэлігійнай палемікі ў прыняцці каштоўнасцей праваслаўя яго каталіцкай часткай. Алесь Вайтылаў, адмаўляючыся ад "мярцвяцкай", аджыўшай спадчыны сваёй маці, далучаецца да хрысціянскіх каштоўнасцей, увасобленых у творы праваслаўнымі святынямі: "*абразом Маці Божае з Жыровіц*" [1, с. 29] і прыняццем манаскага пострыгу ў Опцінай Пустыні [1, с. 33].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такім чынам, увасоблены ў апавяданні Л. Рублеўскай сармацкі гетэрастэрэатып вызначаецца рашучым мастацкім асуджэннем саслоўных каштоўнасцей былой польска-беларускай шляхты як дэзінтэграцыйнага сацыяльнага фактару, адмаўленнем стваральнай ролі былых саслоўных эліт у станаўленні беларускай нацыі як выніку мадэрнізацыйных працэсаў.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Рублеўская, Л.*** Гайвароны / Л. Рублеўская // Маладосць – 2003. – № 1 – С. 27-35.
2. ***Ластоўскі, В.*** Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.
3. ***Караткевіч, У.*** Збор твораў: у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1990. – Т. 7: Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць; Чорны замак Альшанскі: Раман. – 574 с.
4. ***Долбилов, М.*** Полонофобия и политика русификации в Северо-Западном крае империи в 1860-е гг. / М. Долбилов // Образ врага / сост. Л. Гудков; ред. Н. Конрадова. – Москва: ОГИ, 2005. – С. 127-175.

Паступіў у рэдакцыю 20.12.2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова